ГРАМАДЗЯНСКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ
СТУДЗЕНЬ 2014
ВЫДАЕЦЦА З 1997 ГОДА
ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ

ВЗГЛЯД

Основа демократии в государстве – местная власть, **избранная гражданами**

Никакие изменения в верхнем эшелоне властных структур не смогут привести к действительно демократическим преобразованиям в стране в целом, пока в каждом населенном пункте от небольшого села до столицы граждане не будут иметь возможность избрать путем голосования представителей, которым они делегируют право управлять территориями.

Юрий ВОРОНЕЖЦЕВ

При этом часто возникает вопрос, каким образом должен избираться руководитель самого высокого ранга (обозначим его условно «мэр», хотя в разных странах эта должность называется по-разному): прямым всеобщим голосованием всех жителей или его должны выбирать депутаты уже избранного представительного органа местной власти. Для молодых демократий этот казалось бы непринципиальный вопрос может вырасти в проблему, которую преодолеть будет весьма непросто. Существует мнение, что только прямое голосование жителей может считаться полностью демократическим и даст результат, который поможет наладить нормальную жизнь в том или ином городе или селе. Попытаемся разобраться, действительно ли такой метод гарантирует от повторения ошибки, которую сделали жители Беларуси в 1994 году. Восстановление конституционной законности и демократии в Беларуси неизбежно, и необходимо четко представлять каким образом эти перемены сделать необратимыми.

Международный опыт

В ряде стран с устоявшейся демократической системой власти «сверху донизу» выборы мэра осуществляются не всеобщим голосованием граждан, а с использованием иных механизмов. Мы приведем наиболее типичные примеры стран «старой Европы» и недавно вступивших в ЕС.

Германия

В Германии во многих Землях мэров городов выбирают депутаты городских советов. Пошли даже дальше: все больше муниципалитетов принимают такую систему управления, когда бургомистр одновременно возглавляет исполнительную и представительную власть. В «новых землях», присоединенных в ФРГ после объединения с ГДР, такая модель стала доминирующей.

Северогерманская система совета (Norddeutsche Verfassung)

Эта модель действует в землях Северный Рейн-Вестфалия и Нижняя Саксония. Основные ее черты копируют английскую систему организации местной власти.
Совет общины избирает из своего состава бургомистра или обер - бургомистра. Бургомистр председательствует на заседаниях общины и выполняет представительские функции. Одновременно совет назначает - на срок от 6 до 12 лет - профессионального управленца на должность директора общины (Gemeinedirektor) или городского директора (Stadtdirector).
В крупных городах Совет назначает также помощников директора, за которыми может закрепить определенные сферы деятельности (они являются иерархическими подчиненными директора). Директор общины единолично руководит администрацией, готовит и исполняет решения совета.

Модель бургомистра (Bürgermeisterverfassung)

Эта модель организации местного самоуправления распространена в землях Рейнланд-Пфальц, Саар и в сельских общинах Шлезвиг - Гольштейна. Она почти без изменений воспроизводит институциональную организацию французских коммун. Совет избирает из своего состава бургомистра (обер-бургомистра), который одновременно является председателем Совета и главой исполнительной власти общины. Параллельно Совет назначает из числа профессиональных управленцев и из собственного состава управу, в которую входят и бургомистр. Задачей управы является подготовка решений Совета, руководство - под началом бургомистра - общинной администрацией. Бургомистр и Совет могут опротестовывать решения друг друга, причем бургомистр обладает правом отлагательного вето.

>>> 2

1 <<< **Основа демократии в государстве – местная власть, избранная гражданами**

Франция

Мэров французских городов избирают не жители, а муниципальные депутаты, хотя, конечно, на практике исход непрямых выборов определяет всеобщее голосование. Муниципальные выборы во Франции проходят в два тура при пропорциональной системе партийных списков. На первом заседании нового муниципального Совета депутаты избирают из своего состава мэра города или общины и его заместителей. Срок полномочий мэра, как и муниципальных депутатов, составляет 6 лет. Отдельная система голосования, учитывая особую важность здешних выборов для страны в целом, была установлена законом 1982 года для трех крупнейших городов Франции - Парижа, Лиона и Марселя. Здесь выборы мэра проходят не в два, а в три этапа - жители избирают муниципальных депутатов своего района, которые затем выбирают из своего состава членов городского Совета, и уже они абсолютным большинством голосов выбирают мэра.

Литва

Сейм Литвы уже несколько раз пытался внести внести поправки в Конституцию, чтобы узаконить прямые выборы мэра. Но эти попытки пока безуспешны, несмотря на то, что сторонником такого избрания являлась президент Литвы Даля Грибаускайте. На последних выборах в органы самоуправления, которые состоялись в 2011 году, депутаты избирались по партийным спискам, после чего победившие партии, иногда только при формировании коалиции, уже самостоятельно избирали мэра. Иногда перевес голосов был минимальным. Так, 19 апреля 2011 года Вильнюсский горсовет выбрал на пост мэра Вильнюса Артураса Зуокаса. Его кандидатуру поддержали 26 членов горсовета из 51. Конкурентами Зуокаса были консерватор Раймундас Алекна и представитель Избирательной акции поляков Литвы Ярослав Каминский, первый из них получил 16, а второй 9 голосов.

Латвия

Сейм Латвии в 2013 принял решение не передавать на рассмотрение в комиссии законопроект о прямых выборах глав самоуправлений. В настоящее время их из своей среды избирают депутаты городских и краевых дум. Предлагалось ввести прямые выборы мэров, на которых за кандидатов будут напрямую голосовать обычные граждане. Сейм большинством голосов счел данное предложение «не соответствующим пользе работы самоуправлений» и отверг его.

Риски прямых выборов

В странах с устоявшейся демократией способ избрания первого лица местной власти не сильно сказывается на конечном результате и обусловлен зачастую в большей степени традициями, а не политической целесообразностью.

В случае, когда государство и общество не имеют опыта демократического функционирования, прямые выборы могут принести весьма неожиданные результаты. Нередко на выборах побеждают не наиболее эффективные и профессиональные менеджеры или известные политики, а люди, пользующиеся серьезной финансовой поддержкой ставящих на них группировок или популисты, не способные к серьезной системной работе на высокой и сложной должности.
Можно привести в качестве примера последнего мэра украинской столицы Леонида Черновецкого – легендарную и карикатурную личность, который запомнился только своими эксцентричными поступками и малопонятными речами. В России только в прошлом году предъявляли обвинения нескольким напрямую выбранным мэрам. Свежий пример: в ноябре сотрудниками правоохранительных органов задержан мэр Астрахани Михаил Столяров. Он задержан по материалам дела, расследованием которого занимается Следственный комитет. Столярова задержали при получении взятки в 10 миллионов рублей. В недалеком прошлом в Росии существовала возможность избрания на должность мэров людей, напрямую связанных с организованной преступностью. Среди политтехнологов такой тип руководителя получил определение «Робин Гуд».

При избрании мера Советом есть реальная возможность избежать появления подобных персонажей, хотя , конечно, полной гарантии нет. Первое лицо в таком случае является компромиссной фигурой, которая может объединить депутатов и, соответственно, политические структуры, стоящие за ними во благо развития города.

В крупных городах, где в странах бывшего СССР зачастую сосредоточено 80-90 процентов всего бизнеса и политической жизни страны, в случае прямого избрания «сильного мэра» может произойти своеобразное создание параллельных политических структур.

При выборах мэра депутатами, особенно при формировании Совета по пропорциональной системе, партия или коалиция партий несут ответственность за своего выдвиженца и, в свою очередь, могут оказать существенную помощь в его деятельности. При этом невозможен конфликт между городским «парламентом» и избранным мэром.

Таким образом, с учетом международного опыта и анализа возможных рисков в ближайшие 10-15 лет для Беларуси представляется наиболее целесообразной реализация модели выборов первого лица местной власти по схеме:

ГРАЖДАНЕ ► ДЕПУТАТЫ СОВЕТА ► МЭР

Беларусь VS Україна: **студэнцтва**


Студэнцтва – не толькі пара рамантыкі, залікаў і іспытаў. Студэнцтва – гэта яшчэ і час імкнення да ідэалаў, вера ў сябе і ў тое, што навакольны свет можна змяніць да лепшага. Студэнцтва ва ўсе часы грала вельмі важную ролю ў фармаванні грамадскай думкі і вырашэнні унутраных праблем дзяржавы. Студэнты заўжды мелі сваё меркаванне і маглі пастаяць за яго. Студэнты заўжды былі рухавіком да пазітыўных зменаў. Яны ніколі не падпарадкоўваліся ідэалогіі, якая мела на ўвазе іншыя каштоўнасці.

Украіна і Беларусь – братэрскія народы. Абедзьве краіны перажылі войны, сталінізм, перабудову, нялёгкія 90-я і шматлікія крызісы. І ў наш час абодва народа таксама прагнуць пераменаў, жадаюць лепшага жыцця.

Як вядома, моладзь – гэта будучыня. А для любой краіны будучыня ўвасабляецца ў адукаванай перспектыўнай моладзі – студэнтах. Чым жывуць, пра што мараць, чаго жадаюць студэнты Беларусі і Украіны XXI стагоддзя?

Беларусь: пошук сябе, альбо як бяспечна выйсці з дэпрэсіі

Іван:
Я студэнт-інжэнер. У будучым я бачу сябе гукаінжэнерам. Але пакуль што асноўным маім заняткам ўсё ж такі застаецца вучоба. У вольны час я займаюся музыкай, а таксама дрэсірую свайго сабаку. Часам чытаю кнігі перад сном.
На мой погляд, большасць беларускіх студэнтаў днямі занятыя пэўнымі хобі, або проста сядзяць за камп'ютарам (для некаторых гэта таксама хобі). Наогул цяжка сказаць, чым яны цікавяцца. На мой погляд, грамадскім жыццём і праблемамі ўніверсітэце. Маім знаёмым цікава забаўляцца, хадзіць па клубах, падпрацоўваць. Ёсць студэнты, якія з'яўляюцца сябрамі рознага кшталту валанцёрскіх рухаў ды грамадскіх арганізацый. Але такіх, на мой погляд, не больш за 10-15 адсоткаў ад агульнай масы. У вялікіх масштабах калі гэта і робіцца, то толькі для “птушачкі” у справаздачах. Усе лічаць свае праблемы



цікавіцца каля 30-40 адсоткаў беларускіх студэнтаў. Але як яно там ёсць – ня ведаю, бо сам крыху цураюся гэтага.

Вікторыя:
Я вучуся на фізічным факультэце. Вялікую частку майго жыцця займае студэнцкі тэатр.Мне цікава займацца “грамадскай” дзейнасцю ва ўніверсітэце: выступаць, хадзіць на канцэрты. Універсітэт мне патрэбен толькі для таго, каб знайсці для сябе найлепшую працу. У вольны час я люблю спаць, чытаць кнігі альбо глядзець фільмы. Большасць сучасных студэнтаў цікавіцца чым заўгодна, але не ведамі, якія даюць нам ва вышэйшымі за дапамогу навакольным.
На жаль, я таксама ня вельмі актыўная ў такім накірунку. Варта прызнаць сябе бязвольнай гароднінай. Але я спадзяюся, што гэта да той пары, як пайду самастойна працаваць. Увогуле я не асабліва хачу заставацца жыць у Беларусі. Але не таму, што тут кепска. Я проста хачу паглядзець свет. Ды й мне, прынамсі зараз, ня вельмі цікавыя праблемы краіны, у якой я не хачу заставацца.

Уладзь:
Я студэнт-фізік. Навучаюся на бюджэтным аддзяленні і атрымліваю стыпендыю. Зараз вучуся на першай змене: пары зранку да абеда, а пасля – вольны час. Вучобе прысвячаю роўна столькі часу, колькі патрабуецца для таго, каб праверыць наяўнасць патрэбных канспектаў і ручкі ў заплечніку.
Што я раблю ў вольны час? Па вялікім рахунку нічога значнага: сяджу дома за камп'ютэрам, слухаю музыку, гляджу сэрыялы. Чым цікаўлюся? Тут сітуацыя больш неардынарная: зараз – барацьбой з дэпрэсіяй. Наогул нічым асабліва не цікаўлюся, таму што ўсё, чым бы я ні займаўся праз час кідаю. Такі вось пошук сябе атрымліваецца. Думаю, з часам усё ж такі знайду нешта па душы. Зараз спрабую сябе ў сучасных вулічных танцах.

Зміцер:
Я з'яўляюся студэнтам 5 курса гістфака, таму вучобы ў мяне зараз зусім мала. Хутка адбудзецца мой апошні залік. У вольны ад вучобы час я цікаўлюся вандроўкамі. Яшчэ з першага курса сам сабе арганізоўваю вандроўкі: планую маршрут, лагістыку, шукаю начлег. Таксама цікаўлюся беларускім тэатрам, мінскім метрапалітэнам і гісторыяй Санкт-Пецярбурга.

>>> 4

3 <<< **Беларусь VS Украіна: студэнцтва**

Калі казаць пра беларускае студэнцтва, то, хутчэй за ўсё, ім цікавыя клубы, застоллі з алкагольнымі напоямі, стасункі паміж дзяўчатамі і хлопцамі. Але ёсць і іншыя. Я вельмі часта чую як нашыя студэнты абмяркоўваюць грамадска-палітычныя пытанні. Я б сказаў, што студэнцтва сочыць за грамадскім жыццём, але без вялікай цікавасці. Хутчэй за ўсё такая пасіўнасць абумоўлена моцным рэпрэсіўным апаратам, які ўжо шмат год існуе ў нашай краіне і нашых універсітэтах і адсутнічае, напрыклад ва Украіне.

Украіна: на хвалі свабоды

Вера:
Я вучуся на настаўніцу. І ў будучым мне таксама хацелася б працаваць выкладчыкам альбо займацца чым-небудзь такім з людзьмі: тлумачыць, даносіць да людзей інфармацыю, паказваць шлях да “святла ў танэлі”. Гэта вялікае задавальненне! Маё хобі – Вікіпедыя і яе дачэрнія праекты (Вікікрыніцы, Вікісховішча). Ледзь ня ўсе мае знаёмыя ведаюць, што пра Вікіпедзію я магу распавядаць доўга і шмат, бо з'яўляюся сябрам грамадскай арганізацыі “Вікімедыя. Украіна”, якая робіць розныя захады для падтрымкі вольнай энцыклапедыі. А зусім нядаўна я ўладкавалася на працу настаўніцай геаграфіі, таму мой дзень – гэта урокі, пары і падрыхтоўка да ўрокаў ды пар.
Апошнія падзеі ў краіне прымушаюць шукаць час таксама для Еўрамайдана. Бо я хачу, каб мяне перасталі вадзіць за нос. Хочацца, каб да мяне ставіліся як да грамадзяніна, а не як да шэрай масы. Хочацца мяняць людзей, якія “уверсе”. Мажліва іншыя будуць больш шчырымі і нарэшце зробяць рэформы, а не іх імітацыю.

Ірына:
Я навучаюся на даволі спецыфічнай адмысловасьці – “Міжнародная эканоміка”. Гэта значыць, што 70% студэнтаў нашага факультэту думаюць толькі пра знешні выгляд, становішча ў грамадстве, брэндавыя шмоткі, машыны ды пра тое, як бы гламурна сфатаграфавацца ў адным з найдаражэйшых клубаў нашага горада. Гэтыя людзі жывуць вельмі сумна: жыццё жорстка рэгламентавана рамкамі “што можна і што нельга рабіць” у іх сацыяльнай прасторы. Найвышэйшая мара дзяўчат – хутчэй выйсьці замуж за багатага мужчыну. Універсітэт для большасці з іх – гэта пляцык для пошуку “вартага мужчыны”.
Але з іншымі 30% не ўсё так кепска. Яны дастаткова разумныя людзі, займаюць актыўную грамадскую пазіцыю. Зараз максімум часу праводзяць на Эўрамайдане, мараць пра лепшую Украіну, уласна, за што і змагаюцца. Ведаюць 2-3 замежныя мовы, шмат вандруюць па розных краінах, любяць цікава бавіць час з сябрамі. Шмат хто з іх займаецца дабрачыннасцю, арганізоўвае добрыя праекты ў сацыяльнай і экалагічнай сферах, а таксама бізнэсе.

Святлана:
Зараз я навучаюся на 6 курсе. Акрамя навучання яшчэ працую па адмысловасці, каб атрымліваць пэўны досвед. Таксама імкнуся знайсці час для самаразвіцця. Адно з маіх хобі – гэта гітара. Калісьці я вучылася ў музычнай школе і грала на бандуры (народны інструмент), а потым вельмі захацелася навучыцца на гітары. Гэта вялікі плюс для добрай кампаніі – можна спяваць любімыя песні. Да ўсяго, два гады таму я пачала займацца бальнымі танцамі, і гэты занятак моцна зацягнуў. Люблю таксама чытаць кнігі: украінскую і сусветную літаратуру.
Сучасную ўкраінскую студэнцкую моладзь я б ахарактарызавала словам “неабыякавасць”. Студэнты не застаюцца ў баку, не цураюцца грамадскіх праблем, разважаюць над спосабамі іх вырашэння. Шмат хто цікавіцца мастацтвам, асабліва музыкай: самі граюць, ствараюць свае калектывы. Цікавяцца Еўропай, рознымі адукацыйнымі і турыстычнымі праграмамі.

Дар'я:
Я навучаюся на юрыста, але не ўпэўнена, што мая праца мусіць быць выключна юрыдычнай. Я маю ўяўленне пра тое, як мусіць выглядаць мая праца, але дакладна не ведаю, чым бы я хацела займацца. Думаю, трэба спрабаваць. Вядома ж, адна з мараў – мець сваю справу і не працаваць на кагосці.
Мой дзень складаецца з навучання ва ўніверсітэце і стажыроўкі ў Amnesty International (міжнародная арганізацыя, якая займаецца дзеяннямі ў абарону правоў чалавека – заўв. аўтара). Калі казаць пра апошні час, то я намагаюся кожны вечар хадзіць на Еўрамайдан. Наш універсітэт прадстаўляе вельмі актыўная ўкраінская моладзь. Мы аднымі з першых выйшлі на мірны пратэст і заявілі пра страйк. Мы імкнемся па магчымасці прытрымлівацца навучальнага працэсу, які афіцыйна не адменены. Але наша прысутнасць на Майдане – гэта ўжо яго неад'емная частка.

Рэфлексія

Падавалася б: такія блізкія паміж сабой краіны, падобныя традыцыі і абрады, блізкая адна да адной мовы. Але такая розная моладзь, якая расквітнела на руінах Савецкага Саюза. Такія розныя каштоўнасці. Адны – не ведаюць чаго хочуць, бо не бачаць, якія ў іх ёсць перспектывы, магчымасці, альтэрнатывы таму, што маюць. Знаходзяцца пад залішняй апекай з боку бацькоў, універсітэтаў, дзяржавы. Іншыя ж, наадварот, не церпяць над сабой залішняй улады і апекі, прагнуць свабоды, добрай для сябе будучыні. Дакладна ўяўляюць сабе тое, якой яна мусіць быць. Хочацца верыць, што рана ці позна вірус свабоды ўсё ж такі перадасца беларусам ад братоў-украінцаў. І носьбітам яго будзе маладая студэнцкая кроў.





Ад дыскусіі да спраў: у Гомелі адбылося чарговае ток-шоў

Чарговае ток-шоў ад культурніцкай кампаніі “Будзьма беларусамі” адбылося ў Гомелі. Гэтым разам тэмай дыскусіі была абраная гарадская ідэнтычнасць Гомеля. Неабыякавыя гаражане спрабавалі скласці пазл ідэнтычнасці горада, сабраўшы розныя яго як станоўчыя, так і адмоўныя якасці і з'явы. Экспертамі ток-шоў выступілі: супрацоўнік Веткаўскага музея Андрэй Скідан, спецыяліст па пытаннях брэндынгу гарадоў Юры Аканцінаў, а таксама дызайнер і мастак Юры Лукомскі.

Марына ДРАБЫШЭЎСКАЯ

Пра тое як і навошта праводзяцца ў Гомелі ток-шоў, якія ўжо сталі традыцыйнымі, распавёў каардынатар кампаніі “Будзьма беларусамі” Яўген Меркіс: “Падобныя мерапрыемствы ладзяцца ГКК “Будзьма беларусамі” ўжо больш за год па ўсёй Беларусі з мэтай абуджэння дыскусіі і прыцягнення ўвагі да найбольш актуальных пытанняў у сферы нашай культуры. Фармат ўяўляе сабой дыскусію з удзелам экспертаў і публікі – усё як на сапраўдным ток-шоў, але без тэлекамер. На трэцім гомельскім ток-шоў ад “Будзьмы” мы вырашылі засяродзіцца на пытаннях, звязаных з ідэнтычнасцю. Звязана гэтаз цэлым шэрагам супярэчнасцяў і праблемаў, якія мы высветлілі падчас падрыхтоўкі да мерапрыемства.

Так адносна Гомеля існуе вялікая колькасць стэрэатыпаў: яго называюць самым рускім горадам Беларусі, кажуць, што ў ім апроч палаца і парка нічога няма. Нават самі гараджанечаста заяўляюць, што да Румянцава і Паскевіча ў нас гораду не было. Адметнасцю горада лічаць хіба штодабрыню людзей ды прыгажосць дзяўчат. Але з нашых апытанняў і па выніках самога мерапрыемства становіцца відавочным, што ня ўсё так змрочна. Так на пытанне “ці ганарыцеся вы Гомелем?” большасць адказала станоўча і назвала яго родным.Гэта дае пазітыўны базіс, на які можна “нарошчваць” далейшыя характарыстыкі тоеснасці, нагрувашчваць іх зместам.

Падчас дыскусіі гучалі розныя погляды: некаторыя заяўлялі пра тое, што грамадскасць не павінна прыдумляць брэнд і фармуляваць турыстычную прывабнасцьгорада – гэта задача бізнэсоўцаў, іншыя заўважалі, што без удзелу прадстаўнікоў улады і пры адсутнасці дэмакратычных механізмаў уплыву грамадства на прыняцце рашэння падобныя дыскусіі плёну не даюць. Але беларуская рэчаіснасць паказвае, што дыскусіі надзвычай важныя і што нічога не рабіць, чакаючы пакуль табе нарэшце дазволяць думаць законна – не самы лепшы выхад. Канешне, за адзін вечар сфармуляваць і дасціпна апісаць асновы гарадской ідэнтычнасці гамельчукоў, як апынулася, немагчыма, але падобныя дыскусіі дакладна набліжаюць нас да разумення таго, як мы сябе ўспрымаем і чым можам ганарыцца.Так што варта працягваць і надалей!

Хочацца адзначыць, што мерапрыемства сапраўды атрымалася вельмі ўдалым. І тое даказваецца гарачынёй абмеркаваннаў і колькасцю ўдзельнікаў ток-шоў. Прыемна таксама тое, што большасць з іх – гэта моладзь. І што самае важнае – гэта моладзь неабыякавая да праблемаў роднага горада..

Николай Новиков проанализировал экономическую ситуацию

В общественно-политическом центре 16 января прошла встреча с экономистом Николаем Новиковым.

После общего обзора современного состояния мировой экономики и тенденций ее развития, эксперт остановился на проблемах Беларуси. Николай Новиков проанализировал имеющиеся в настоящее время формы проявления кризиса белорусской экономики, а также сравнил текущую экономическую ситуацию с состоянием дел в 2011 г., когда произошел обвал.

По мнению эксперта, государство должно уменьшать свое присутствие в экономике и сосредоточиться на развитии образования, науки, здравоохранения и т.д., то есть на тех направлениях, которые по определению относятся к сфере ответственности правительства. Необходима приватизация, причем акции следует продавать белорусам. Это должны быть акции прибыльных предприятий, а не банкротов. Тогда у граждан появится перспектива и желание участвовать в решении экономических проблем страны. Пока же правительство готово продавать предприятия кому угодно, но не своим гражданам.



У Гомелі з гастролямі пабываў Свабодны тэатр

У Гомельскім грамадска-палітычным цэнтры жадаючыя змаглі пабачыць спектакль “Ліст для Кэці Акер. Мінск'11”, які з'яўляецца пераможцам Эдынбугрскага фестываля Fringe-2011.



І сапраўды, варта адзначыць, што спектакль атрымаўся вельмі ўдалым. Пастаноўка прымушае гледача паразважаць пра ролю Беларусі на сусветнай арэне, пра унутрыпалітычнае становішча краіны праз простых яе жыхароў і абсалютна простыя штодзённыя з'явы. А таксама накіроўвае думкі гледача ў галіну беларускай сэксуальнасці ці асэксуальнасці.



Гульня актораў бездакорна передае падзеі, якія адбываліся напрацягу 2011 года ў Беларусі: маўклівыя акцыі, шматлікія затрыманні, тэракт і г.д.. Гледзячы спектакль пачынаеш усведамляць, што асаблівa нічога з 2011 года па сённяшні дзень і не змянілася, акрамя курсу даляра ды коштаў на цукар і іншыя прадукты харчавання.

Безумоўным поспехам спектакля з'яўляецца акторская гульня і востры шчыры сцэнар, не упрыгожаны нічым залішнім. Мастацтва мусіць правакаваць людзей на эмоцыі, з чым пастаноўка спраўляецца ў поўнай меры.

В новый год - **с новыми долгами и старыми проблемами...**

Зимы ждала, ждала природа.
Снег выпал только в январе…
«Евгений Онегин», А.С.Пушкин.

В.Д. НОВИКОВ IIIIIIIIIIIIIII

Последние месяцы все говорили о деньгах, о том, что их нет.
Настроение тревожности все больше проявлялось не только на заседаниях правительства, оно проникло в поведение обывателей. Проблем накопилось много, и, они касаются практически всех. В канун Нового Года стало известно о выделении кредита Россией на 2 миллиарда долларов. Теперь деньги есть. Значит, передышка получена, о проблемах можно забыть. Катастрофа откладывается.
Раньше боялись правительства. Его непопулярных и все менее понятных мер. Настроение изменилось. Сейчас боятся за правительство, сможет ли оно удержать ситуацию, удержать то, что есть. Призрак 2011 года висит над страной, ощущение полного разноса всплывает в памяти.
В нашей не самой богатой стране хронически не хватает валюты. Ладно бы ее не хватало предприятиям для импорта необходимых компонентов, но ее не хватает и населению. В результате цена белорусского рубля падает, а зарубежных денег растет. Мы уже привыкли, что в рыночной экономике чего- то не бывает много или мало. Бывает то, что мы можем купить или то, чего не можем купить. Как говорят студенты, если спрос большой или предложение недостаточное возникает нехватка, дефицит по-советски. Почему спрос большой, потому что покупают не только для импорта, но и для хранения. О том, что у нас импорт больше экспорта знает всякий. Валюта нужна для расчетов. И это проблема, которая требует отдельного рассмотрения. К этому вернемся позже. Помимо средства обращения в мировой торговле, в нашей стране доллар выступает средством сбережения для населения, своего рода ценной бумагой с нулевой доходностью (более точно, отрицательной) и низкой степенью риска. Риск состоит в том, что возможны колебания к евро. Тут можно потерять. К рублю он всегда растет или иногда стоит на месте. Доллар широкодоступен, поэтому и популярен. Его может купить всякий и пенсионер, и студент. Две трети своих сбережений белорусы хранят на валютных счетах.
Помимо этого, значительные суммы хранятся в наличной валюте. Хранить деньги просто в рублях нет смысла. Инфляция, невидимый и беспощадный вор всегда идет рядом, от него нет спасения. Где же выход? Чтобы отвратить обывателя от навязчивого иностранца, надо дать что-то более привлекательное. Национальный банк нашел и приписал такое лекарство, а коммерческие банки его выдают. Они предлагают вклады в белорусских рублях под высокие проценты. Населению это понравилось.
Любопытно, что наши ближайшие соседи также стали активно переводить свои рубли в белорусские и вкладывать их в белорусские банки.
Удалось придержать инфляцию, ослабить давление на рубль.
Все бы хорошо, но лекарство оказалось не просто горьким, но и опасным для другой части экономики, реального сектора экономики. Высокие проценты по депозитам означают еще более высокие проценты по ссудам. Для предприятий заемные деньги, - средство вкладывать, инвестироватьв производство товаров и услуг, для потребителей, - возможность совершать покупки в кредит товаров и услуг. Высокие проценты по кредитам предприятий это часть, и немалая, себестоимости их продукции.
Себестоимость растет, а значит высокие отпускные цены, конкурентоспособность падает, сокращается производство,прибыль меньше, налоговых поступлений не хватает покрыть запланированные расходы. А дальше начинается «оптимизация». Слово не новое, и изначально положительное, но с недавних пор приобретшее зловещий оттенок. Как только министры его произносят, так и знай, и рабочих мест в бюджетной сфере станет меньше и зарплата упадет. Учителям остается осваивать восточную йогу. Только так можно и потреблять мало, и оставаться в равновесии.
Круг замыкается, такая политика укрепления рубля подрывает производство. С заоблачными процентами хозяйственнику, не то, что заработать, выжить сложно. Не будет дешевых товаров, не будет экспорта. Другие страны могут заменить наши товары,за небольшим исключением. Они обойдутся без нашего экспорта, а мы от импорта не можем отказаться. Опять экспорт больше импорта, нужно искать валюту, чтобы покрыть разницу. Опять долги. Опять обыватели бегут от рубля.
Белорусский рубль теряет все признаки полновесной национальной валюты. Он только частично выполняет функции денег: меры стоимости, средства обращения, средства сбережения и накопления. Наиболее ценные покупки измеряют в долларах, даже собственное правительство уровень зарплаты и то измеряет в долларах. Наиболее масштабные покупки, квартиры, машины и прочее также делаются в долларах. Про сбережения мы уже говорили. За последние четыре года и тут иностранец обосновался. Наша и без того не самая сильная экономика кредитует американскую. Покупки и вложения обеспечивают реальное содержание, наполнение американских денег, обосновавшихся в стране. А что рубль, он застенчиво сторонится, и уже не вполне хозяин в собственном доме. Постепенно скатывается на роль разменного денежного средства. Соответственно и национальный банк не может эффективно использовать рычаги денежного регулирования экономики.
Каков выход? Он не будет простым. Мы не будем говорить обо всех возможных мерах. Остановимся на одной. На приватизации. Люди, когда слышат это слово, вспоминают бешеное обогащение одних и такое же стремительное обнищание других в начале 90 х годов. Сейчас же, государство если и готово на приватизацию, то только для иностранцев.

>>> 8

7 <<< **В новый год - с новыми долгами и старыми проблемами…**

Нужна широкая, если угодно народная приватизация.
Речь идет о продажи акций успешных предприятий за белорусские рубли рядовым белорусам.Такие предприятия в стране есть и они известны. Белорусы должны иметь возможность вкладывать свои сбережения в свою экономику. Если Белоруськалий, например, предложит на рынке часть своих акций, думаю, многие белорусы предпочтут их иностранной валюте. Рыночная стоимость этого предприятия колеблется, по оценкам, в районе 34 миллиардов долларов. Контрольный пакет стратегического предприятия пусть остается у государства. Достаточно предложить относительно небольшие доли акций крупных предприятий, чтобы связать свободную рублевой денежную массу. Это, в свою очередь, окажет сдерживающее влияние на уровень цен на рынках товаров и услуг. У белорусов, наконец, появится возможность использовать эффективные инструменты размещения своих сбережений в своей стране. Предприятия смогут привлекать денежные средства под нулевой процент. Снизится долларизация экономики, что будет оказывать стабилизирующее влияние на валютный курс. Широкое участие национальных миноритариевв приватизации повысит привлекательность белорусских предприятий для потенциальных стратегических инвесторов. Возникнут реальные механизмы рыночной оценки деятельности предприятий. Не только органы службы президентского контроля будут следить за деятельностью фирм, но тысячи акционеров.
Конечно, необходимо предусмотреть меры, чтобы предотвратить спекулятивные атаки на зарождающемся рынке. Это могут быть различные ограничения, количественные на покупку, временные на перепродажу и другие меры.
Без создания и развития национального фондового рынка, стабилизация денежно-финансовой сферы страны невозможна. Первые шаги уже нужно делать сейчас. Иначе придется опять только ждать и надеяться, на чью- то очередную помощь.

Перадвыбарны працэс у Грузіі істотна адрозніваецца ад беларускага. Паназіраць яго ўдалося дзякуючы арганізацыі Belarus Watch, якая акрэдытавала мяне ў якасці назіральніка за прэзідэнцкімі выбарамі.

Марына ЯЎСЕЙЧЫК IIIIIIIIIIIIII

Агітацыя па-грузінску

Тбілісі ператварыўся ў горад плакатаў, якія часам ўтваралі сабой суцэльнае палотнішча, якое цягнулася на даволі доўгай адлегласці. Яно складаецца з партрэтаў кандыдатаў у прэзідэнты. Кожны кандыдат мае сваю лічбу, якая напісана на агітацыйным плакаце.
Перад маімі вачыма мільгаюць мужчынскія і жаночыя твары. Найчасцей адны і тыя ж: пяты нумар, дванаццаты, сорак першы.
Плакаты вісяць у самых нечаканых месцах: на слупах побач з зебрай, па якой пераходзяць вуліцу; на бетонных сценах; на паўразваленых плытах старых закінутых дамоў; пад мастамі каля бакаў са смеццем; у метро. Нават стваы дрэваў пашкодзілі фарбай, вывеўшы праз трафарэт адпаведную лічбу, якая адпавядае нумару таго, альбо іншага кандыдыта ў прэзідэнты. Візуальна гэта выглядае эфектна. Ідзеш па алеі з пяцёрачак, напрыклад. А пасля тыя пяцёрачкі закрэсленыя, і каля іх напісана новая лічба. Своеасаблівая агітацыйная “барацьба” за голас на карысць пэўнага кандыдата.
У цэнтры горада трапіўся на вочы проста велічэзны плакат з нумарам чатырнаццаць. Складаецца ўражанне, што жанчына-кандыдат глядзіць на праспект з птушынай вышыні. А пад гэтым плакатам — шэраг маленькіх, з нумарамі сорак адзін, пятнаццаць, дванаццаць. І ўсе гэтыя нібыта насценныя “постэры” абсалютна не перашкаджаюць гараджанам і бурліваму жыццю сталіцы. Каля партрэтаў кандыдатаў стаяць жабракі з працягнутымі рукамі, альбо “тусіць” моладзь.
Заўважыла шмат пашкоджаных плакатаў. З падмаляванымі вусікамі ці рожкамі, альбо ўвогуле, груба пачырканымі. І толькі адзін сарваны, сёмы нумар, ляжаў на асфальце, закіданы лісцем.
Што тычыцца агітацыйнай публікацыі ў газеце, альбо агітацыйнай рэкламы, то над загалоўкам і ў вуглу павінен быць надпіс “платная палітычная рэклама” альбо “незалежная палітычная рэклама”. Аб'ём агітацыйнай праграмы ад аднаго кандыдата ў прэзідэнты не павінен перавышаць адну трэцюю паласы. Беларускі выбарчы Кодэкс, напрыклад, дазваляе кандыдатам у прэзідэнты бясплатна публікаваць да пяці машынапісных старонак.
Цікава, што ў грузінскім выбарчым Кодэксе ёсць асобны пункт наконт забароны букмекерскай дзейнасці.
Вярнуўшыся ў Беларусь, пацікавілася ў знаёмай грузінкі, ці пасціралі са стваловў дрэў лічбы. Па заканадаўству гэта павінны былі зрабіць цягам пятнаццаці дзён пасля сканчэння выбараў. На той момант прайшло ўжо амаль тры тыдні. Па словах жанчыны, ствалы дрэў заставаліся ў агітацыйнай тэме. Раслін мне сапраўды шкада. Яны не бетонныя сцены.

ИНФОРМАЦИОННЫЙ БЮЛЛЕТЕНЬ

Алексей Коваль, а/я 28, 246003, Гомель. Тираж 299 экз.